# Магчымасці бібліятэкі значна пашырыліся

У чытачоў Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Карскага з'явілася магчымасць віртуальна карыстацца літаратурай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іншых беларускіх і расійскіх бібліятэк.

Цяпер, каб патрапіць у Нацыянальную бібліятэку, гродзенскаму чытачу не абавязкова ехаць у Мінск. Доступ да шмат якіх выданняў можна атрымаць, будучы чытачом абласной бібліятэкі, праз электронную бібліятэчную сістэму «Універсітэцкая бібліятэка анлайн».

У гэтай сістэме налічваецца больш за 100 тысяч кніг па ўсіх галінах ведаў ад вядучых беларускіх і расійскіх выдавецтваў: вучэбная і навуковая літаратура, энцыклапедыі, слоўнікі, ілюстраваныя выданні па мастацтве, публікацыі студэнцкіх навуковых прац, а таксама перыёдыка.

Акрамя гэтага, супрацоўнікі бібліятэкі імя Карскага ствараюць уласныя інфармацыйныя рэсурсы: электронны каталог, у якім будуць змешчаны ўсе выданні фондаў абласной бібліятэкі. Дзякуючы гэтай навінцы можна будзе з хатняга камп'ютара даведацца, ці ёсць у бібліятэцы тое ці іншае выданне.

Ствараюцца таксама базы дадзеных «Гісторыка-культурных каштоўнасцяў прынёманскага краю» і «Легенды Гродзеншчыны: галерэя знакамітых асоб».

**Аляксей МІХАЛЁЎ.**